проведение скоординированной, согласованной или единой политики в отраслях экономики, определенных Договором и международными договорами в рамках Союза [1, с. 22]. Данное интеграционное объединение влияет на экономику Беларуси, как с положительной стороны, так и с отрицательной.

**Литература**

1. Евразийский экономический союз. Вопросы и ответы. Цифры и факты. — М. : Б.и., 2014. — 216 с.

2. Кнобель, А. Возможные экономические последствия торгового соглашения между Таможенным и Европейским союзами / А. Кнобель, Б. Чокаев // Вопросы экономики. — 2014. — № 2. — С. 68–87.

# Уніяцкая царква Беларусі ў сучаснай англамоўнай гістарыяграфіі

*Гутоўскі А. Б., студ. IV к. ГрДУ ім. Я. Купалы,*
*нав. кір. праф. Марозава С. В., д-р гіст. навук*

Гісторыя ўніяцкай царквы як феномена беларускай гісторыі цікавіць даследычкаў з краін Заходняй Еўропы і Злучаных Штатаў Амерыкі.

Манаграфія даследчыцы з Ілінойса Барбары Скіннер “The western front of the eastern Church: Uniate and Orthodox Conflict in the 18th-century Poland, Ukraine, Belarus, and Russia” [1] прысвечана ўзаемаадносінам уніяцкай і праваслаўнай цэркваў у XVIII ст. Аўтар сцвярджае, што праваслаўная царква, якая ў Рэчы Паспалітай цярпела прыцясненні, пасля далучэння Беларусі да Расійскай імперыі змяніла свой статус і стала пануючай. Дзяржаўныя ўлады накіравалі свае намаганні на падпарадкаванне каталіцкай царквы, абмежавалі яе сувязі з Рымам, стварылі ўласную сістэму кіравання каталіцкай царквой і вымусілі Папу зацвердзіць яе. Палітыка Кацярыны ІІ адносна ўніятаў характарызуецца як паступовая, адзначаецца, што імператрыца не прызнавала за ўніяцкай царквой права на існаванне. Асобна разглядаецца дысідэнцкае пытанне ў кантэксце падзелаў Рэчы Паспалітай. Адбываюцца выпадкі ўмяшання расійскіх улад у справы Рэчы Паспалітай пад выглядам прыцяснення дысідэнтаў.

Акрамя палітыкі Кацярыны ІІ характарызуецца і палітыка яе пераемнікаў: Паўла І, Аляксандра І і Мікалая І. Кожны з іх праводзіў самастойную палітыку адносна ўніяцкай царквы: Павел І падаецца як ліберал, які не прыцясняў уніяцкую царкву, нават дазволіў ёй аднавіцца. Кіраванне Аляксанра І адзначаецца як часовы мір перад апошнім наступам, што адбываецца пры Мікалаі І, і заканчваецца Полацкім царкоўным саборам і ліквідацыяй уніяц-

кай царквы. Але галоўная адмоўная роля адводзіцца Кацярыне II, якая загадала абгрунтаваць правы Расіі на гэтыя тэрыторыі і пачала наступ на ўніятаў, а тыя, каб зберагчыся ад праваслаўя, пачалі пераходзіць у каталіцызм.

Навуковы зборнік “On the Border of the Worlds” [2] прысвечаны гісторыі Кіеўскай мітраполіі ў сярэднія вякі і новы час. Яго аўтарамі з’яўляюцца вядомыя спецыялісты ў гэтай галіне гісторыі Ігар Скачыляс, Міхаіл Дзмітрыеў, Томаш Кемпа, Леанід Цімашэнка, Анджэй Гіль, Вітольд Бобрык. Усе яны прытрымліваюцца думкі, што ў мінулым праваслаўная царква моцна паўплывала на развіццё Усходняй Еўропы.

Т. Кемпа ў артыкуле “Stauropegic Brotherhood of Vilno and Brotherhood Monastery as the Most Important Orthodox Centre in the Grand Duchy of Lithuania at the End of the 16th and in the 17th Centuries” даследуе шляхі адраджэння праваслаўнай царквы ў XVI–XVII стст. Адным са спосабаў гэтага з’ўляліся праваслаўныя брацтвы, прыкладам якіх можа паслужыць брацтва Святога Духа ў Вільні. Пасля заключэння Брэсцкай уніі брацтвы пачалі барацьбу за захаванне праваслаўя як канфесіі. Т. Кемпа патлумачыў прычыны пераходу кіеўскага мітрапаліта М. Рагозы на бок уніі.

Аўтар канстатуе, што апазіцыйныя ўніі погляды брацтваў мелі значны ўплыў на антыўніяцкія настроі ў гарадах. Але даследчык згаджаецца, што праваслаўныя вернікі, як магнатэрыя, так і простыя людзі, і святарства, падзяліліся на прыхільнікаў і праціўнікаў уніі. Даследчык аддае даніну павагі праваслаўным братам, бо падчас ганенняў яны не шукалі дапамогі ў іншых краінах, у першую чаргу, у Расіі.

На думку Т. Кемпы менавіта вайна 1654–1667 гг. паміж Рэчу Паспалітай і Расіяй прывялі да згортвання дзейнасці Віленскага брацтва і Святадухаўскага манастыра, у якім яно знаходзілася.

Украінскі даследчык Леанід Цімашэнка ў артыкуле “Prince Konstanty Wasyl Ostrogski and the “Single-Faith” Muscovy” паведамляе аб узаемаадносінах кіеўскага ваяводы К. Астрожскага з Маскоўскай дзяржавай. Аўтар піша, што Астрожскі быў абаронцам праваслаўя ў сваёй краіне, ВКЛ, а жыхары суседняй Маскоўскай дзяржавы былі з ім адной веры. Л. Цімашэнка сцвярджае, што адносіны паміж К. Астрожскім і Маскоўскай дзяржавай былі вельмі складанымі. Даследчык сцвярджае, што для Астрожскага была характэрна трохступенная самаідэнтыфікацыя: першай Айчынай была Русь, другой — Літва, а трэцяй — Польшча.

Разважаючы аб царкоўнай уніі у сваім лісце да І. Пацея, К. Астрожскі пісаў, што неабходна ўсеагульнае аб’яднанне канфесій. У артыкуле аўтар таксама прыходзіць да высновы, што неабходна разглядаць рэлігійныя і палітычныя погляды К. Астрожскага.

Разам з тым Л. Цімашэнка піша, што нельга характарызаваць адносіны Астрожскага і Маскоўскай дзяржавы як «станоўчыя / адмоўныя». Гэта залежала ад шматлікіх фактараў. З апошніх тэзісаў артыкула вынікае, што пры жыцці К. Астрожскага ВКЛ і Маскоўская дзяржава не цікавілі адзін аднаго.

А. Гіль у артыкуле "The First Images and the Beginning of the Cult of the Archbishop of Polock Josaphat Kuncewiczin the Polish-Lithuanian Commonwealth till the mid-17th Century" звяртаецца да праблемы з'яўлення першых ікон, прысвечаных Ясафату Кунцэвічу. Менавіта яго забойства прывяло да ўмацавання ўніяцтва і з'яўлення ўласнага погляду на свет і сваё месца ў ім.

А. Гіль лічыць, што пакутніцкая смерць прывяла да таго, што вернікі пачалі лічыць Кунцэвіча святым. Менавіта гэта паўплывала на мітрапаліта І. Руцкага, які пачаў працэс беатыфікацыі Кунцэвіча ў 1624 г. Гэтым скарысталіся і ўлады Рэчы Паспалітай. З'яўленне ікон было выклікана папулярызацыяй асобы Я. Кунцэвіча, а таксама неабходнасцю даслаць яго выяву ў Рым. Аўтар адзначае, што на першых іконах адсутнічаюць прадметы, якія характэрны для пазнейшых ікон — пальмавай галінкі і сякеры

Пасля паспяховай беатыфікацыі культ Кунцэвіча распаўсюдзіўся ў Полацку, дзе і быў пахаваны епіскап. Але кананізаваць яго не атрымалася, таму мала захавалася слядоў яго культу.

Вышэй згаданы зборнік значна пашырае веды аб царкоўна-рэлігійным жыцці Кіеўскай мітраполіі ў XVI–XVIII стст., падзеі якога аказалі ўплыў на далейшы лёс уніяцкай царквы Беларусі.

Такім чынам, у англамоўнай гістарыяграфіі гісторыя ўніяцкай царквы не можа пахваліцца вялікай колькасцю даследаванняў, якія ў асноўным прадстаўлены англамоўнымі работамі польскіх і ўкраінскіх гісторыкаў, акрамя кнігі Б. Скіннер. Гэта, магчыма, выклікана тым, што падзеі, звязаныя з дзейнасцю ўніяцкай царквы, не датычыліся іншых краіны. Нягледзячы на малую колькасць работ, кола праблем, якое закранута ў англамоўнай гістарыяграфіі, дастакова шырокае: дзейнасць царкоўных брацтваў, узаемаадносіны К. Астрожскага з Масквой, фарміраванне культу Я. Кунцэвіча, праваслаўна-ўніяцкі канфлікт у XVIII ст., царская палітыка ў дачыненні ўніяцкай царквы і іншыя.

### Літаратура

1. Skinner, B. The Western Front of the Eastern Church. Uniate and Orthdox Conflict in 18th-century Poland, Ukraine, Belarus, and Russia / B. Skinner. — Illinois: Nothern Illinois University Press, 2009. — 295 p.

2. On the Border of the Worlds: Essays about the Orthodox and Uniate Churches in Eastern Europe in the Middle Ages and the Modern Period / A. Gil, W. Bobryk. — Siedlce-Lublin: Akademia Podlaska, Instytut Europy Srodkowo-Wschodnej, 2010. — 186 p.